# ПРЫЯРЫТЭТНЫ НАПРАМАК
# У ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОЦЕ СУЧАСНАЙ ШКОЛЫ

**М. У. Шардыка**, *настаўніца*
*беларускай мовы і літаратуры вышэйшай*
*катэгорыі сярэдняй школы № 159 г. Мінска*

Патрыятычнае выхаванне – прыярытэтны напрамак у выхаваўчай рабоце сучаснай школы, якому надаецца асаблівая ўвага. Развіваць патрыятычныя пачуцці, фарміраваць патрыятычную свядомасць – гэта тое, да чаго імкнецца кожны класны кіраўнік і кожны настаўнік.

Шырокімі магчымасцямі для патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення валодае школьны музей. У сярэдняй школе № 159 горада Мінска, у якой я працую, ёсць музей баявой славы партызанскай брыгады «Аляксей», якой камандаваў Герой Савецкага Саюза Аляксей Фёдаравіч Данукалаў.

Музей у нашай школе – гэта месца асаблівае. Сюды прыходзяць усе: вучні, настаўнікі, бацькі. Частыя госці – ветэраны. Сёння цяжка ўявіць нашу школу без музея. Але шлях да яго стварэння быў няпросты.

Ініцыятарамі работы па стварэнні музея сталі дырэктар школы Таццяна Уладзіміраўна Сычова і былы разведчык брыгады імя Данукалава Пётр Леанідавіч Лебедзеў. Кіраўніком пошуковай работы, а потым і музея была намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Святлана Паўлаўна Главацкая. Былі наладжаны сувязі з Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, з музеямі, у якіх знаходзіліся матэрыялы пра А.Ф. Данукалава, у тым ліку з Музеем баявой славы ў в. КаваліЛіёзненскага раёна, якія дзяліліся матэрыяламі, адрасамі былых партызан брыгады, парадамі па афармленні музея.

У далёкім 1987 г. пасля трохгадовай пошукавай работы вучняў і настаўнікаў у сярэдняй школе №159 адчыніў свае дзверы музей баявой славы партызанскай брыгады «Аляксей».

Кіруе работай савет музея, у склад якога ўваходзяць дзесяць вучняў. Каардынатарам дзейнасці савета музея на працягу амаль 20 гадоў з’яўляецца настаўніца гісторыі Валянціна Васільеўна Жук. Падрыхтавана група экскурсаводаў з вучняў 8–11 класаў. Створана група з вучняў 10–11 класаў, якая распрацавала цыкл лекцый па ваеннай тэматыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З пачатку свайго існавання музей з’яўляецца цэнтрам грамадзянскага і патрыятычнага выхавання падлеткаў. 27 красавіка 1994 г. (50 гадоў з дня гібелі камбрыга) 18 вучняў школы разам з настаўнікамі і група былых партызан брыгады наведала магілу А.Ф.Данукалава ў г. Лепелі. Гэта падарожжа было знята беларускім тэлебачаннем і паказана ў інфармацыйнай праграме «Панарама». У ліпені 1994 г. на базе музея да 50-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў было праведзена ўрачыстае мерапрыемства па ўручэнні ветэранам мікрараёна ўзнагарод .

Сустрэчы з ветэранамі-данукалаўцамі адбываліся кожны год у дзень нараджэння Аляксея Данукалава (29 лютага ) ці ў бліжэйшыя да гэтай даты дні, у дзень гібелі героя (27 красавіка), у час святкавання Дня Перамогі і Дня Абаронцаў Айчыны. Кожны раз вучні даведваліся пра што-небудзь новае з партызанскага жыцця ветэранаў, пра жыццё і барацьбу самога Данукалава.

На жаль, сёння амаль нікога з ветэранаў брыгады (мінчан) няма ў жывых. Яны пахаваны на могілках Мінска. Але ў лютым 2009 г. у выніку сумеснай пошукавай работы з Саветам ветэранаў Фрунзенскага раёна г.Мінска адбылася сустрэча з былой юнай разведчыцай брыгады «Аляксей» Зінаідай Аляксееўнай Бабоўка. А ў сакавіку 2012 г. вучнямі 9 «А» класа былі сабраны матэрыялы яшчэ аб адной партызанцы брыгады «Аляксей» – Марыі Фядотаўне Логінавай.

У цяперашні час піянеры і члены БРСМ, а таксама вучні школы вядуць работу па зборы матэрыялаў пра лёс ветэранаў, якія жывуць у мікрараёне школы, – «Ветэраны разам з намі».

Вялікую цікавасць у вучняў школы выклікала акцыя «Вялікая Айчынная вайна ў лёсах маіх родных». Многія класы падрыхтавалі падборкі сачыненняў пра лёсы родных людзей: сваякоў, бабуль, дзядуль, афармілі сабраныя матэрыялы. Але гэта работа яшчэ не закончана.

Матэрыялы і экспанаты музея з’яўляюцца адпраўной кропкай для сур’ёзнай навуковай работы. Летам 2007 г. вучні школы прайшлі па месцах баёў «Шляхамі дзвюх Айчынных войн» агульнай працягласцю 137 км. Матэрыялы, сабраныя ў паходзе, зараз знаходзяцца ў музеі.

Арганізавана сумесная работа з ветэранскай арганізацыяй пры ЖЭС-83 мікрараёна школы. Фонды музея пастаянна папаўняюцца новымі экспанатамі і матэрыяламі, якія прывозяць вучні пасля канікул ад сваіх родных і блізкіх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Савет музея – ініцыятар і арганізатар мерапрыемстваў акцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся»: вялікая пазнавальная гульня для вучняў 3–4 класаў «Запаведныя сцежкі Радзімы», урачыстае адкрыццё дошкі «Ганаровыя жыхары Фрунзенскага раёна», школьны конкурс «Зямля бацькоў – мая зямля», конкурсы «Медаль у маім доме», «Вялікая Айчынная вайна ў лёсах маіх родных». Члены савета музея падрыхтавалі рэфераты з цыкла «Славутыя людзі Беларусі», аформілі альбом з фотаработамі вучняў «Зямля бацькоў – мой родны дом». На працягу навучальнага года вучні школы выязджаюць на экскурсіі па Беларусі. Яны пабывалі ў Брэсцкай крэпасці, у Гродне, Лідзе і Слоніме, Гальшанах і Крэве, Полацку і Магілёве, Гомелі і Віцебску.

На базе музея праходзяць урокі мужнасці, дні памяці А.Ф. Данукалава. На працягу навучальнага года праводзяцца аглядныя і тэматычныя экскурсіі, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы Фрунзенскага раёна, воінамі-інтэрнацыяналістамі. Традыцыйнымі з'яўляюцца ўрачыстыя прыёмы ў рады БРПА і БРСМ. Як правіла, павязваюць піянерскія гальштукі і ўручаюць білеты членаў БРСМ ветэраны вайны і працы.

У 2008/09 навучальным годзе ў практыку выхаваўчай работы на базе школьнага музея ўвайшла новая форма арганізацыі дзейнасці – вялікая патрыятычная гульня «Нашчадкі Данукалава».У ёй удзельнічаюць вучні пятых класаў. Гульня праводзіцца ў некалькі этапаў, пачынаецца і завяршаецца традыцыйнымі лінейкамі ў музеі. У судзействе прымаюць удзел ветэраны вайны і працы мікрараёна. Конкурсы гульні – бліц-турнір «Наш школьны музей», «Імя на стэндзе школьнага музея», конкурс патрыятычнай песні. У ходзе падрыхтоўкі да ўдзелу ў конкурсе вучні вывучаюць матэрыялы асноўнага і дапаможнага фондаў музея, ствараюць праекты і рыхтуюць справаздачы аб праведзенай рабоце ў выглядзе аформленых матэрыялаў. На аснове гэтай работы створана новая экспазіцыя «Ветэраны радам з намі».

Па ініцыятыве савета музея ў школе прайшоў конкурс «Медаль у маім доме». Лепшыя работы былі адпраўлены на раённы конкурс.

У музеі праходзяць урокі па гісторыі Беларусі, факультатыўныя заняткі па вывучэнні гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Класныя кіраўнікі праводзяць там класныя і інфармацыйныя гадзіны. Частыя госці ў нашай школе вучні школ і гімназій раёна і горада. Інфармацыя пра школьны музей неаднаразова з'яўлялася ў рэспубліканскім перыядычным друку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучні і настаўнікі школы ганарацца сваім музеем, любяць яго і разумеюць, што ён не толькі дапамагае фарміраваць патрыятычную свядомасць і пачуцці, а яшчэ і з’яўляецца такім месцам у школе, куды можна прыйсці і ўспомніць тых, без каго не было б ні радасці, ні шчасця, ні жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ